# 20 год Гродзенскай дыяцэзіі. 40

Аўтар: Рэдакцыя
27.12.2012 01:00

2011 год

6 – 8 мая - У Воранаве адбыліся Дыяцэзіяльныя дні моладзі пад дэвізам “Збудаваныя на Хрысце”.
28 мая - У гродзенскай катэдры святарскія пасвячэнні атрымалі: кс. Артур Валчкевіч, кс. Аляксандр Вілюшкевіч і кс. Ян Коўш.
1 чэрвеня - У Гродне адбыўся I Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці пад дэвізам “Засей зерне любові”. † 1 чэрвеня - У Слоніме а. Вітольд Жэльветра адзначаў 25-годдзе свайго святарства.
5 чэрвеня - У Хадзілонях кс. бп Аляксандр асвяціў новую капліцу.
13 чэрвеня - У Адэльску адзначалася 30-годдзе святарскіх пасвячэнняў аб-па Тадэвуша Кандрусевіча.
13 чэрвеня - У Малой Бераставіцы адзначалася 60-годдзе парафіяльнай святыні.
14 – 17 чэрвеня - У Гродне адбылася III Парафіяда дзяцей і моладзі пад дэвізам “Божая міласэрнасць – адзіная надзея сучаснага свету”.
25 чэрвеня - У Тракелях адбылася I Дыяцэзіяльная сустрэча настаўнікаў і выхавацеляў.
1 ліпеня - У Шылавічах святкавалася 500-годдзе парафіі.
26 ліпеня - У парафіяльным касцёле ў Вішневе адбылося 200-годдзе асвячэння вуглавога каменя.
5 жніўня - У гродзенскай катэдры адбылося адкрыццё і асвячэнне галоўнага алтара.
13 жніўня - У пабрыгідскім касцёле адбыліся ўрачыстыя манаскія шлюбы с. Марыі Фаўстыны з супольнасці сясцёр назарэтанак.
14 жніўня - У Беліцы (дэк. Ліда) адбылося асвячэнне новага касцёла.